МЕРКАВАННЕ

# У АБВЯШЧЭННІ ПЯЦІГОДКІ ЯКАСЦІ ЗАКЛАДЗЕНЫ ПРЫНЦЫП СТРАТЭГІЧНАГА ПРАДБАЧАННЯ



**Сяргей ХАМЕНКА, намеснік старшыні Савета Рэспублікі:**

— Паняцце якасці датычыцца літаральна ўсіх сфер жыцця і дзейнасці нашай дзяржавы. Сама назва «Рэспубліка Беларусь» на сённяшні дзень ужо з'яўляецца брэндам — гэта сімвал справядлівасці, мірнага суіснавання і высокай якасці жыцця людзей. Таму мы разумеем, што абвешчаная ўказам кіраўніка дзяржавы пяцігодка якасці датычыцца не толькі прамысловасці і эканомікі. Гэта датычыцца і сферы жыццёвых, сацыяльных адносін унутры нашага грамадства — гэта і гістарычная памяць, і захаванне тых пазіцый, якія закладзены нашымі продкамі. У самім паняцці якасці закладзена адпаведнасць тым патрэбам, якія на сёння ёсць у нашым грамадстве.

Вядома, якасць — не толькі вытворчасць, але пры гэтым важна памятаць і разумець, што Беларусь — экспарцёр больш чым у 200 краін (тыя ж самыя малочныя прадукты ведаюць літаральна ва ўсім свеце). Сусветны рынак прадугледжвае жорсткую канкурэнцыю, спажыўцы ў XXI стагоддзі вельмі патрабавальныя, і якасць — адзін з найважнейшых фактараў, каб яе вытрымаць. Можна сказаць, што ў абвяшчэнні пяцігодкі якасці закладзены прынцып стратэгічнага прадбачання, якое ў нашага Прэзідэнта на працягу 30 гадоў мы назіраем у самых розных сферах. Пяцігодка якасці — гэта стварэнне ўмоў, якія будуць спрыяць развіццю нашай дзяржавы ў наступныя пяць гадоў.

З'яўляючыся каардынатарам выканання Мэт устойлівага развіцця ў Беларусі, не магу не згадаць і іх у кантэксце пяцігодкі якасці. Гэта, па сутнасці, эканамічны, сацыяльны і экалагічны кірункі развіцця грамадства дзеля будучых пакаленняў. Для нашай краіны Мэты ўстойлівага развіцця — гэта рэальнасць, яны не толькі прадэкларыраваныя, але і рэалізуюцца на практыцы. Гэта прызнаюць нават не самыя лепшыя сябры нашай краіны.

Кожны год пяцігодкі якасці будзе тэматычным. Такі падыход да абазначэння асноўных кірункаў — гэта прыклад кіраўнічай дзейнасці дзяржаўнага маштабу нашага кіраўніка краіны. Для таго каб вызначыць гэтыя асноўныя кірункі, праводзіцца глыбокі маніторынг эканамічнай і сацыяльнай абстаноўкі, якая складваецца як вакол нашай краіны, так і ўнутры яе. І зноў жа, гаворачы аб стратэгічным прадбачанні нашага Прэзідэнта, неабходна сказаць, наколькі правільна выбіраецца, куды накіраваць асноўныя намаганні. Будаўніцтва Беларускай АЭС, дзеянні падчас пандэміі ковіду, узмацненне бяспекі дзяржавы, меры па захаванні яе суверэнітэту... Рэспубліканскія органы дзяржкіравання, грамадзянская супольнасць дакладна ведаюць, куды менавіта накіраваць намаганні і рэсурсы, каб дасягнуць вызначанай мэты, дабіцца максімальнага рэзультату.

# УРАЧЫСТА І МАШТАБНА

**Якім у Беларусі будзе святкаванне 80-годдзя Вялікай Перамогі, абмеркавалі ва ўрадзе**



Фота БелТА.

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА ўчора, 21 студзеня, правёў пасяджэнне Рэспубліканскага аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 80-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне.

Ён адзначыў, што летась быў праведзены комплекс мерапрыемстваў, прысвечаных 80-годдзю вызвалення Беларусі:

— Мерапрыемствы прайшлі на высокім арганізацыйным і ідэйна-палітычным узроўні, выклікалі пазітыўны грамадскі рэзананс у грамадзян нашай краіны і замежных гасцей.

Раман Галоўчанка працягнуў, што на дадзены момант аргкамітэт знаходзіцца на пэўным экватары сваёй работы:

— Мы нацэлены на правядзенне мерапрыемстваў да 80-годдзя Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне на такім жа высокім узроўні. Падрыхтоўка ўжо вядзецца.

Прэм'ер-міністр паведаміў, што многія мерапрыемствы арганізаваны, праводзяцца ў планавым парадку, і патлумачыў:

— Гэта датычыцца ўвекавечання памяці абаронцаў Айчыны, ваенна-мемарыяльнай, ваенна-пошукавай работы, рэстаўрацыі і прывядзення ў належны стан памятных месцаў. Асаблівая ўвага, вядома ж, надаецца клопату аб ветэранах і асобах, якія пацярпелі ад наступстваў вайны. У арганізацыях аховы здароўя вядзецца работа па лячэбна-дыягнастычных мерапрыемствах у рамках комплексных медыцынскіх аглядаў.

Асобным блокам Раман Галоўчанка прапанаваў абмеркаваць правядзенне мерапрыемстваў 9 мая 2025 года:

— Прэзідэнтам пастаўлена задача разам з традыцыйнымі для такіх дат мерапрыемствамі (урачысты сход, канцэрт, парад) правесці яшчэ адно — на пляцоўках Мінскага міжнароднага выставачнага цэнтра, а менавіта своеасаблівую выстаўку, прысвечаную 80-годдзю Перамогі і дасягненням сучаснай беларускай абароннай прамысловасці, для таго каб паказаць нашу пераемнасць у гэтым пытанні.

Прэм'ер-міністр прапанаваў агучыць падыходы ў гэтым кірунку прадстаўнікоў ведамстваў і дадаў, па якой прычыне:

— Мінабароны, Мінкультуры, Дзяржкамваенпрамам прадстаўлены пэўныя прапановы па арганізацыі гэтага мерапрыемства, але ў поўным аб'ёме іх назваць канцэпцыяй нельга. Таму заслухаем асноўныя падыходы і ўдакладнім задачы.

У гутарцы з журналістамі першы намеснік міністра культуры Дзмітрый Шляхцін расказаў пра выстаўку да 80-годдзя Перамогі, якую арганізуюць у Мінскім міжнародным выставачным цэнтры.

Паводле яго слоў, яна будзе даволі вялікая:

— Цяпер мы адпрацоўваем пытанні па плошчах, таму што паралельна ў цэнтры будуць праходзіць і іншыя выставачныя мерапрыемствы. Гэтая выстаўка дазволіць нам паказаць прадметы, звязаныя з тэмай Вялікай Айчыннай вайны, якія або вельмі даўно не экспанаваліся, або не экспанаваліся зусім. Там прадставяць свае экспанаты Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, Нацыянальны гістарычны музей, мемарыяльны комплекс «Брэсцкая крэпасць — герой» і рэгіянальныя музеі. Усю гэту прадметную базу мы цяпер адпрацоўваем.

Першы намеснік міністра агучыў спадзяванні, што ўдасца даволі шырока і якасна паказаць тэму генацыду беларускага народа.

Таксама вельмі цікавай для наведвальнікаў тэмай на выстаўцы стане побыт беларускіх партызан. Спікер падкрэсліў, што асноўная задача — яшчэ раз паказаць усім, што зрабіў беларускі народ дзеля Вялікай Перамогі, і тое, як Беларусь на сучасным этапе захоўвае гістарычную праўду.

Дзмітрый Шляхцін дадаў, што цэнтральныя мерапрыемствы пройдуць у Мінску, але праграма мерапрыемстваў па лініі Міністэрства культуры даволі шырокая і ахоплівае ўсю краіну.

# ВЫСОКІЯ ТЭХНАЛОГІІ, ДЭМАГРАФІЯ, ПАЛЯПШЭННЕ ІНФРАСТРУКТУРЫ

**Над чым у бліжэйшыя пяць гадоў будзе працаваць медыцына**

Павышэнне нараджальнасці, умацаванне здароўя насельніцтва, лічбавая трансфармацыя, развіццё высокатэхналагічных відаў меддапамогі будуць ключавымі кірункамі для аховы здароўя ў найбліжэйшыя пяць гадоў, аб'яўленых пяцігодкай якасці.

## ПАДТРЫМКА МАЦЯРЫНСТВА

Як адзначылі ў Міністэрстве аховы здароўя, Беларусь уваходзіць у дзясятку краін з самымі нізкімі паказчыкамі дзіцячай смяротнасці. У краіне забяспечана стапрацэнтнае прыняцце родаў кваліфікаванымі ўрачамі. Функцыянуе шматузроўневая сістэма аховы здароўя маці і дзіцяці. Для павышэння нараджальнасці гарантавана правядзенне адной бясплатнай спробы ЭКА і прапануецца абмеркаваць магчымасць правядзення другой.

У РНПЦ «Маці і дзіця» на працягу 15 гадоў паспяхова праводзяцца высокатэхналагічныя ўнутрычэраўныя аперацыі. Арганізаваны банк груднога малака, працуюць выязная рэанімацыйна-кансультатыўная брыгада і вучэбна-трэніровачны цэнтр. Выкарыстоўваецца клетачная тэрапія для карэкцыі псіханеўралагічных парушэнняў у неданошаных нованароджаных. Укаранёны і працуюць мадэльныя цэнтры па навучанні бацькоў асновам бяспечнай жыццядзейнасці дзяцей.

## ДЫСПАНСЕРЫЗАЦЫЯ І СКРЫНІНГІ

Ключавая задача ва ўмацаванні здароўя насельніцтва — узмацненне эпідэміялагічнай бяспекі і зніжэнне ўзроўню захваральнасці. Плануецца забяспечыць усеагульны ахоп насельніцтва паслугамі першаснай медыцынскай дапамогі, у тым ліку за кошт удасканалення дыспансерызацыі і медыцынскіх скрынінгаў.

Зрэшты, неанатальны скрынінг праводзіцца ў РНПЦ «Маці і дзіця» для ўсіх нованароджаных і ўключае тэсціраванне на пяць захворванняў: фенілкетанурыю, першасны прыроджаны гіпатырэоз, мукавісцыдоз, галактаземію і прыроджаную дысфункцыю кары наднырачнікаў. У цэлым па краіне ў дарослых праводзіцца скрынінг раку малочнай залозы, раку прастаты, каларэктальнага раку, раку шыйкі маткі, скрынінг цукровага дыябету II тыпу і інш.

## ВЫСОКАТЭХНАЛАГІЧНАЯ ДАПАМОГА

Ужо сёння для лячэння пацыентаў з інсультам прымяняюцца высокатэхналагічныя метады: унутрывенны трамбалізіс з выкарыстаннем рэкамбінантнага тканкавага актыватара плазмінагену, механічная эндаваскулярная тромбэкстракцыя, эндартэрэктамія, ангіяпластыка і стэнціраванне сонных і вертэбральных артэрый.

**Мяркуецца пашырыць аб'ёмы аказання высокатэхналагічных відаў медыцынскай дапамогі ў галіне кардыяхірургіі, нейрахірургіі і трансплантalогіі, траўматалогіі і артапедыі, анкалогіі і пластычнай эстэтычнай хірургіі, а таксама стаматалогіі.**

Летась у краіне выкананы 492 аперацыі па трансплантацыі органаў. У галіне кардыяхірургіі агульная колькасць аперацый на сэрцы і каранарных сасудах склала 20 259. У галіне траўматалогіі і артапедыі летась выкананы 21 349 эндапратэзаванняў буйных суставаў, з іх тазасцегнавога сустава — 13 921, каленнага сустава — 7415, плечавога сустава — 13.

## НОВЫЯ ПАЛІКЛІНІКІ І БАЛЬНІЦЫ

Не менш важная задача — развіццё інфраструктуры аховы здароўя. Намечана будаўніцтва амбулаторна-паліклінічных арганізацый аховы здароўя ў Полацку, Гомелі, Заслаўі, Фаніпалі, Крычаве, Мінску. З'явяцца новыя лячэбныя карпусы (профільныя аддзяленні) бальніц у Паставах, Гомелі, Гродне, Заслаўі, Мінскім раёне (Мінская абласная клінічная бальніца), Магілёве. Запланавана рэканструкцыя лячэбных карпусоў у Брэсце, Пінску, Давід-Гарадку, Віцебску, Чавусах, Гродне, Мінскім раёне (Рэспубліканская клінічная бальніца медыцынскай рэабілітацыі і РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі і імуналогіі), Мінску.

**Алена КРАВЕЦ.**